■ Урокі жыцця

ЧАЛАВЕК БЕЗ ЛЮБВІ ЗГАСАЕ

Дзіця любіць неабавязкова, галоўнае — яго правільна выхаваць. Так лічаць некаторыя псіхолагі. Сярод педагогаў існуе шмат розных поглядаў на гэтую з'яву і мноства распрацаваных метадаў па выхаванні дзяцей. Але ёсць меркаванне пра любоў, якое не змяняецца ўжо больш за дзве тысячы гадоў. Яго трансліруе хрысціянская рэлігія. Так што ж такое любоў з хрысціянскага пункту гледжання? Ці ўсе людзі здольныя палюбіць? У гэтым мне дапамог разабрацца настаяцель прыхода храма святога Мікалая Японскага у Мінску, іерэй Павел СЯРДЗЮК.

— Айцец Павел, што такое любоў у хрысціянскім разуменні?

— Хрысціянскі пункт гледжання грунтуецца не проста на нейкай суме разважанняў, не на даследаваннях прадмета, а на з'яве любові праз справы.

Гэта не эмоцыі і пачуцці. Сапраўдная любоў — гэта дар, які просяць і чакаюць. Да гэтага дару трэба рыхтавацца. Шлях набыцця дароў Божых — гэта шлях працы і самаадрачэння, гэта шлях выйсця за межы свайго эга.

— Любоў бывае рознай: да радзімы, бацькоў, дзяцей. Ці любоў — гэта нешта адзінае?

— У нас і сапраўды вельмі розныя паняцці і з'явы маюцца на ўвазе пад гэтым словам. Напрыклад, у грэчаскай мове існуе восем слоў, якія акрэсліваюць тую ці іншую ўласцівасць любові. Калі мы кажам пра ўзаемнае прыцягненне мужчыны і жанчыны, то гэта эрас. Эрас — дар Божы. У залежнасці ад таго, як ён рэалізуецца, гэты дар можа стаць блаславеннем, а можа і праклёнам...

Любоў-агапэ — братэрская любоў. Падчас набажэнства, напрыклад, прамаўляюцца такія словы: «З вераю і любоўю прыступім, каб стаць нам прычаснікамі жыцця вечнага». У тэксце літургіі на грэчаскай мове слова «любоў» азначае нейкае тамленне, прагу і прадчуванне сустрэчы, свяшчэннае трапятанне тых, хто моліцца, тых, хто вельмі жадае сустрэцца са сваім Богам.

Ёсць і іншыя паняцці гэтага слова ў грэчаскай мове. Вельмі часта мы прысвойваем адно і тое ж слова розным з'явам, тым самым часта страчваем яго сэнс. Любоў — гэта святое слова, прынцып жыцця, прынцып быцця.

— Але некаторым здаецца, што яны не здольныя палюбіць...

— Гэта не так. Мы ўсе нараджаемся ў любові. Нават калі мы з'явіліся на свет не ў спрыяльных умовах. Тым не менш, Бог нас любіць і дае нам магчымасць спазнаць радасць быцця. Кожны чалавек здольны палюбіць. Нават адпетыя разбойнікі, нават самыя агрубелыя і жорсткія душы. Усё адно ёсць тое, што можа крануць агрубелую душу і растапіць яе, хай нават на імгненне, і гэта ўжо кажа пра здольнасць любіць. Семя любові ёсць у кожным. Іншае пытанне, развіваем мы яго ці не. Хрысціянін, які развівае ў сабе любоў, стараецца з усімі знаходзіцца ў міры. Такі чалавек у першую чаргу любіць Бога, таму што Ён і ёсць сапраўдная крыніца любові. Потым бацькоў, мужа ці жонку, дзяцей і блізкіх. А хто блізкі? Тут трэба ўспомніць прытчу пра самарыцяніна, якая вырашыла гэтае пытанне навекі. Калі ёсць чалавек, які мае патрэбу ў тваёй дапамозе, ведай: гэта і ёсць твой блізкі. Хрысціяне ва ўсе часы здзіўлялі менавіта тым, што імкнуліся рабіць справы любові. Хрысціяне жывуць не рэфлекторна. Іх учынкі выходзяць за межы інстынкту самазахавання і размнажэння. Гэта зямныя людзі з нябесным жыццём. У гэтым сэнсе, калі чалавек, напрыклад, усынаўляе дзіця — гэты ўчынак «ненатуральны» для сучаснага свету. Гэта ўчынак супраць скоранай прыроды чалавека, і знешнія ўмовы нас да гэтага не прымушаюць, а ўнутранае жаданне рухаецца ў іншым кірунку.

І гэта тычыцца не толькі ўсынаўлення. У дні Вялікага посту падчас царкоўнай службы мы не чуем: «Не ешце маянэзу», мы чуем: «Апраніце распранутага, накарміце

Кожны чалавек здольны палюбіць. Нават адпетыя разбойнікі, нават самыя агрубелыя і жорсткія душы.

галоднага, увядзіце ў дамы тых, хто ў гэтым мае патрэбу». І калі настае пост, адразу становіцца ясна, чым мы займаемся — пастом ці дыетай.

— Што рабіць, калі чалавек усвядоміў, што больш не жадае знаходзіцца побач з блізкім і нават не хоча мець з ім ніякіх зносін?

— Цікава атрымліваецца: да першых цяжкасцяў заўсёды хочацца жаніцца, усынавіць, сябраваць, а тут на табе — пачуцці зніклі. Жыццё не чарнавік — яго немагчыма бясконца перапісваць. І нават два разы перапісаць цяжка. Усе сродкі добрыя для таго, каб захоўваць, ствараць і ўзгадоўваць. Сёння ў дапамогу людзям дадзены і псіхолагі, і Царква. Калі ласка, нічога не перашкаджае павялічваць сваю кампетэнцыю ў адносінах з людзьмі, у выхаванні дзяцей. Разбурыць заўсёды лягчэй, але звычайна гэта прыносіць толькі боль...

Бог людзей ствараў якраз для таго, каб людзі самі маглі ствараць. Калі чалавек знаходзіць у сабе нелюбоў, то ён не можа адчуваць сябе арганічна ў гэтым стане, бо ў ім дзейнічаюць сілы, якія яго разбураюць. Ад гэтага ёсць выратаванне — пакаянне, споведзь і... справы любові.

— І што, пасля гэтага з'явіцца пачуццё?

— Нават калі няма пачуцця, то ўсё роўна рабі добрае і тады пачуцці прыйдуць.

Калі чалавек прызнаецца сабе ў тым, што ён не здольны палюбіць, — гэта пазітыўны крок, ён ужо не думае пра сябе як пра нейкага «добрага» чалавека.

З іншага боку, нямногія валодаюць вопытам духоўнага ўспрымання жыцця. Хрысціянін, выявіўшы ў сабе нешта падобнае, адразу разумее, што з ім адбываецца. Бачыць свае слабасці, сябелюбства, эгаізм і прыходзіць паспавядаць гэта перад Богам. Тады адбываецца такая «жыватворная разрадка», як напісана ў псалме: «Ускладзі на Бога смутак свой, і Ён цябе ўмацуе». А смутак — гэта ўсе чалавечыя недасканаласці, немачы і паскуднасць. Не можаш палюбіць, прасі ў Бога хоць бы таго, каб ты не атручваў жыццё іншаму.

Што тычыцца ўсынаўлення, то я лічу гэты крок беспамылковым у жыцці чалавека. Таму што гэта — крок дзеля іншага. У гэтым выпадку, як ні круці, адсутнічае «шкурны інтарэс». Але, каб прыёмнаму бацьку атрымаць дапамогу ад Бога, трэба паспрабаваць паглыбіць сябе ў духоўнае жыццё. Богу з намі таксама няпроста.

Бог стварыў людзей ад паўнаты любові, і тыя, хто бярэ дзяцей да сябе ў дом, напэўна, таксама робяць гэта ад паўнаты свайго быцця. Адчыняючы дзверы свайго дома для чужога дзіцяці, будучыя бацькі перакананы, што ў іх сэрцы знойдзецца месца яшчэ для аднаго чалавека. І прымаць такога чалавечка трэба ўжо такім, які ён ёсць. Да сустрэчы з ім ты нічога ў яго не ўклаў, таму ўкладваць трэба цяпер, калі дзіця ў цябе дома. Гэта не проста, таму што бацькоўская любоў — праца кожны дзень.

Мне здаецца, што ў сітуацыі нелюбові да дзіцяці лепш зрушыць акцэнты з любові як эмоцыі, пачуцця — да спраў любові. Можна ж сябе прымушаць да гэтых спраў! Часам гэта рабіць непрыемна. Але ў нейкі мо-

Калі мой знаёмы браў дзяцей да сябе ў сям'ю, у яго не ўставала пытанне «палюблю — не палюблю». Ён проста робіць справы любові. А такія намаганні заўсёды прыносяць плён.

мант уцягваешся і пачынаеш разумець і прымаць гэты свой вопыт. Калі ў сям'і «чужое» дзіця, то бацькоўскаму інстынкту нарадзіцца ў адно імгненне няма адкуль. Да таго ж гісторыя жыцця дзіцяці часта абцяжарана адмоўным вопытам таго пакалення, якое выклікала яго да жыцця. Але гэта не значыць, што такая сітуацыя безнадзейная.

Мой знаёмы святар з Днепрапятроўска, які адкрыў дзіцячы дом сямейнага тыпу, распавёў мне дзіўную гісторыю. У яго жыве дзяўчынка, якую з двух гадоў гвалтаваў сужыцель яе маці. Здавалася б, што такая душэўная рана ніколі не загоіцца. Але прайшлі гады, і ў дзіцяці няма ніякіх сімптомаў гэтай траўмы. Мой знаёмы ўпэўнены, што менавіта любоў чалавека з дапамогай Бога можа вылечыць самы глыбокі дзіцячы боль. Гэта

якраз тая любоў, да якой трэба сябе прымушаць. Калі мой знаёмы браў дзяцей да сябе ў сям'ю, у яго не ўставала пытанне «палюблю — не палюблю», «хачу — не хачу». Ён проста робіць справы любові. А такія намаганні заўсёды прыносяць плён.

Чалавек без любові згасае. Яму проста неабходна яе ствараць і дарыць — і не важна, у якіх аб'ёмах... Калі ствараеш любоў, то ўжо ўсё адно, у якім ты сацыяльным статусе, усё адно ты шчаслівы. Тыя, хто акумулюе ў сабе любоў і імкнецца рабіць справы любові, прыцягваюць увагу. Але не толькі тых, якія жадалі б навучыцца добраму і далучыцца да радасці, але і тыя сілы, якія радасці не прыносяць. Да такога чалавека прыходзіць шмат спакус і выпрабаванняў. І калі крыніцай добрых спраў з'яўляецца не любоў, а славалюбства, то такі чалавек многае церпіць, пакуль не ўзгадуе ў сабе шчырую любоў. А калі ў чалавека пачынае расці шчырая любоў, то ён зможа перанесці ўсе выпрабаванні, ён перарасце і перажыве ўсё.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ

НАРОДЖАНЫЯ 29 сакавіка

Гэтыя людзі ўважліва і скрупулёзна вывучаюць становішча, перш чым пачынаюць дзейнічаць. Яны могуць быць мудрагелістымі і вёрткімі партнёрамі, але не з тых, хто здраджвае ці кідае ў бядзе. Тыя, хто нарадзіўся ў гэты дзень, не пыхлівыя, ім не патрабуецца грамадскае прызнанне. Яны любяць камфорт і ўсе задавальненні жыцця. Большасць з іх — выдатныя сябры, партнёры і прыяцелі, валодаючы шматлікімі прывабнымі якасцямі, яны заслужана любімыя; варта прызнаць, што яны не толькі заўважаюць заганы ў іншых, але і бачаць іх у сабе. Многія з гэтых людзей ніколі не пакідаюць сямейнага гнязда, і іх жыццё праходзіць у асяроддзі старых сцен, сяброў дзяцінства і сентыментальных успамінаў.

НАРОДЖАНЫЯ 30 сакавіка

Гэта асобы вельмі прамалінейныя, яны рэдка звяртаюць увагу на вынікі сваіх дзеянняў. Захопленыя сваім іміджам, надзвычай сур'ёзна ставяцца да таго, што пра іх думаюць. Паражэнні толькі ўмацоўваюць іх рашучасць ісці наперад. Прытрымліваючыся толькі асабістых перакананняў і ідучы раз і назаўсёды абраным шляхам, яны не прымаюць чужых думак. Іх энергія цалкам накіравана на работу, без якой яны не бачаць свайго існавання. Ва ўзаемаадносінах з тымі, хто побач, яны паўстаюць выключна патрабавальнымі асобамі, і нават калі партнёр іх задавальняе, яны ўпарта будуць працягваць навязваць яму свае ідэі і стыль жыцця. Яны па-свойму вельмі адданыя і гатовыя прыйсці на дапамогу сябрам і родным.

ОАО «Красная Звезда»

Учетный номер плательщика: 190184544
Вид экономической деятельности: 22220, 22110, 22150
Организационно-правовая форма: 1131
Орган управления: 2330
Единица измерения: млн руб.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2013 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2013 года	На 31 декабря 2012 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	38 590	34 033
Нематериальные активы	120	9	18
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132		-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	23	16
Долгосрочные финансовые вложения	150	-	-
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180		-
ИТОГО по разделу I	**190**	**38 622**	**34 067**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	6 135	6 821
В том числе:			
материалы	211	1 610	2 208
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	4 525	2 100
товары отгруженные	215	-	2 513
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	71	194
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	310	102
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	8 615	589
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	-
Денежные средства и их эквиваленты	270	471	782
Прочие краткосрочные активы	280	1 327	2 087
ИТОГО по разделу II	**290**	**16 929**	**10 575**
БАЛАНС	**300**	**55 551**	**44 642**
Собственный капитал и обязательства	Код строки	На 31 декабря 2013 года	На 31 декабря 2012 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	5 711	5 311
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	36 536	31 071
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	7 703	1 888
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		3 276
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**49 950**	**41 546**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**-**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	4 732	2 774
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	1 085	398
по авансам полученным	632	280	145
по налогам и сборам	633	784	487
по социальному страхованию и обеспечению	634	153	150
по оплате труда	635	640	563
по лизинговым платежам	636	1 018	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	772	1 031
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	10
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	869	312
ИТОГО по разделу V	**690**	**5 601**	**3 096**
БАЛАНС	**700**	**55 551**	**44 642**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2013 года

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2013 года	За январь–декабрь 2012 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	35 645	26 385
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(23 396)	(18 034)
Валовая прибыль (010 – 020)	030	12 249	8 351
Управленческие расходы	040	(6 288)	(4 589)
Расходы на реализацию	050		-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	5 961	3 762
Прочие доходы по текущей деятельности	070	1 254	903
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(1 460)	(665)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	5 755	4 000
Доходы по инвестиционной деятельности	100	13	-
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	13	-
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	-	-
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104		-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	-	-
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111		-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112		-
Доходы по финансовой деятельности	120	-	9
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121		7
прочие доходы по финансовой деятельности	122		2
Расходы по финансовой деятельности	130	(20)	(8)
В том числе:			
проценты к уплате	131	(19)	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(1)	(8)
прочие расходы по финансовой деятельности	133		-
Иные доходы и расходы	140	(8)	-
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140)	150	(15)	1
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150)	160	5 740	4 001
Налог на прибыль	170	(1 033)	-
Изменение отложенных налоговых активов	180	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	190	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200)	210	4 707	4 001
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	23 827	-
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	28 534	4 001
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	2 374	1 928
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	0/0	0/0

Руководитель *Маланяк И.Н.*
Главный бухгалтер *Нестерович Т.В.*

«ВІНАВАТЫ ТОЛЬКІ Я»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Самагубства — сам па сабе жахлівы ўчынак. Яшчэ горш, калі гэта робяць «за кампанію». Летась у Клічаўскім раёне павесіліся дзве стрыечныя сястры, адной з іх было 15, другой 16 гадоў. **Следчы па асабліва цяжкіх справах СК па Магілёўскай вобласці Алена КРАЎЧАНКА** займалася гэтай справай не адзін месяц.

— Яна мела вялікі рэзананс, — кажа Алена. — Памятаеце, калі ў Падмаскоўі дзве дзяўчынкі разам саскочылі са шматпавярховіка? Пра гэта крычалі з усіх каналаў радыё і тэлебачання. Той выпадак стаў шокам нават для 10-мільённай расійскай сталіцы. Што тут казаць пра нашу краіну, дзе жыве столькі ж жыхароў, колькі ў адной Маскве...

Алена змагла даведацца пра клічаўскіх дзяўчынак шмат падрабязнасцяў, якія нават не ведалі іх маці. Яна размаўляла з іх настаўнікамі, аднагодкамі, суседзямі. Дзяўчынак не цікавіла школа. На ўроках яны не маглі трымаць увагу больш за 10 хвілін — круціліся, шапталіся, слухалі музыку ў тэлефонах. Не было іх і сярод тых, хто наведвае нейкія гурткі ці секцыі. І не толькі таму, што ў сельскай мясцовасці, мякка кажучы, іх не хапае, проста ім і гэта было нецікава.

У іх было іншае жыццё, пра якое блізкія нават і не здагадваліся. І не толькі таму, што дзяўчаты нешта ўтойвалі. Яны былі цалкам аддадзены самі сабе. Праваахоўнікі знайшлі ўпакаваныя рэчы — здавалася, што дзяўчынкі збіраліся ў далёкае падарожжа. Магчыма, хтосьці, акрамя іх, гэта і ведаў, але толькі не маці.

— Сястрычкі былі ў сям'і зусім не такімі, як за парогам свайго дома, — кажа Алена. — Для блізкіх яны ўсё яшчэ заставаліся маленькімі дзецьмі. А ў сацсетках і на дыскатэках паводзілі сябе, як дарослыя жанчыны.

Як потым высветлілася, дзяўчынкі яшчэ за паўтара месяца да свайго самагубства разыгралі смерць у інтэрнэце. Іх цікавіла, як да гэтай ідэі паставяцца іншыя. Але тыя, хто ведаў іх больш дасканала, казалі: яны вельмі любілі жыццё. Адна з іх нават на класнай гадзіне ў школе неяк заявіла, што суіцыд — гэта дрэнна, што Гасподзь пакарае тых, што робіць гэта. Вось такі парадокс.

Апошнія суткі сёстры правялі разам, на кватэры адной знаёмай. Яна аддала ім ключы, а сама перабралася на нейкі час у іншае месца. У гэтай жа кватэры дзяўчат і знайшлі павешанымі. Яны віселі побач, быццам, нават адпраўляючыся ў невядомасць, баяліся застацца адна без адной. Здаецца, яны «крычалі» — мы нікому не патрэбны, таму мы і сышлі разам.

Напэўна, так яно і ёсць. Тая самая дзяўчынка, якая казала, што суіцыд — гэта дрэнна і нават дзесьці ў душы баялася Бога, пакінула маці пасмяротную запіску. Гэта было яшчэ перад тым, як яна адправілася на тую фатальную кватэру. Пакінула на самым бачным месцы. Яе спачатку знайшла малодшая сястра, якая ў свае 7 гадоў яшчэ не магла асэнсаваць таго няшчасця, якое вось-вось павінна было здарыцца. Яна нават выправіла памылкі і занесла лісток маці. Тая таксама спачатку не вельмі ўважліва паставілася да гэтага жахлівага паслання. І толькі на наступны дзень забіла трывогу. Іх шукалі з міліцыяй, але хто ж мог падумаць, што яны хаваюцца недзе ў чужой кватэры! А калі знайшлі, было ўжо позна. На месцы трагедыі засталася і пасмяротная запіска другой дзяўчынкі, якая таксама прасіла маці ёй дараваць...

У іх было іншае жыццё, пра якое блізкія нават і не здагадваліся. І не толькі таму, што дзяўчаты нешта ўтойвалі. Яны былі цалкам аддадзены самі сабе.

Самае жудаснае, што трагедыя мела працяг. У загінулых сястрычак былі яшчэ дзве сяброўкі. На працягу года абедзве зрабілі спробу сысці з жыцця. У адной гэта атрымалася.

У сваёй пасмяротнай запісцы яна напісала жудаснае: сяброўкі клічуць мяне. Здаецца, папахвае сектай. Але нічога такога, што сведчыла б аб гэтым, следчыя не выявілі.

Не трапіць у тунэль

На мове спецыялістаў суіцыд — гэта феномен, які цяжка распазнаць ці спрагназаваць. Але факт застаецца фактам — людзі, якія пайшлі на такі крок, былі па-касмічнаму адзінокія. Адзінокія настолькі, што не змаглі даверыцца нікому. Ёсць такое паняцце — тунэль. Гэта так вобразна назвалі той стан, калі чалавек заблытаўся ў жыцці і не бачыць іншага выйсця, акрамя аднаго — нырнуць у гэты злашчасны тунэль і збегчы.

— Тут можа быць толькі адзін дыягназ: недастатковая або няправільная апека, — лічыць **магілёўскі медсудэксперт-псіхолаг Надзея САРАЕВА**. — Бяда ў тым, што ва ўсіх гэтых сітуацыях з самагубствам бацькі не ведаюць, што адбывалася з іх дзіцем. Калі б ведалі, гэтай памылкі не было б. Але дзесьці ўсё роўна атрымліваецца пралік.

Эксперты сцвярджаюць: адзінай прычыны няма, у дзяцей гэты стан шмат у чым абумоўлены сітуацыяй. Вось падлетак павесіўся, хоць мог у гэты момант пайсці кагосьці пабіць або напіцца. Суіцыд дзіцячы — гэта спецыфічныя, на навуковай мове — дэвіянтныя паводзіны.

Што можа тут зрабіць грамадства? «Тое ж самае, што і ў дачыненні да злачыннасці, — лічыць эксперт. — Мы бачым толькі тых падлеткаў, якія дрэнна сябе паводзяць, а вось тых, у каго прыкладныя паводзіны, нават не заўважаем. Але ж бывае такое няшчасце, якое не праяўляецца. Усе дзеці, якія скончылі жыццё самагубствам, былі ў свой час агледжаны псіхолагам. Яны ўсе былі нармальныя».

...«Вінаваты толькі я...» — гэта ўсё, што засталося ад 12-гадовага Дзмітрыя, які пайшоў з жыцця 2 гады таму.

— Хлопчык быў з добрай сям'і, вучыўся ў гімназіі, меў добрыя адзнакі, — расказвае афіцыйны **прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці Аксана САЛЯНЮК**. — Але аднойчы прыйшоў дадому, патэлефанаваў маці, каб паведаміць ёй аб гэтым, а потым узяў і... скокнуў уніз з 7 паверха.

Па водгуках настаўнікаў, блізкіх, сяброў ён быў вельмі кампанейскім, удзельнічаў у алімпіядах па матэматыцы. А тут прагуляў заняткі, бацькі даведаліся пра гэта і прачыталі мараль. Але ж гэта не злачынства. Дзяцей трэба выхоўваць. Вось толькі ён, кажуць, вельмі блізка да сэрца прымаў усякую крытыку.

— Не кожнаму хапае ўмення суперажываць, — кажа Надзея Сараева. — Вось, напрыклад, упаў чалавек. Адзін прайшоў міма моўчкі, другі паспачуваў, трэці кінуўся дапамагаць. Мы ўсе вельмі розныя. Бацькам трэба суперажываць сваім дзецям яшчэ больш, чым суперажывалі ім, калі яны былі маленькімі. А яны, часцей за ўсё выхоўваюць дзяцей так, як выхоўвалі калісьці іх. Але ж усё мяняецца. Інфарматызацыя грамадства расце, а разам з гэтым і колькасць стрэсаў. Падлеткам, у якіх няма жыццёвага вопыту, цяжка бывае вытрымаць гэты псіхалагічны прэс. Іх не трэба пакідаць адных, інакш яны пакінуць нас. Назаўсёды. Было б добра, калі б існавала суправаджэнне сем'яў, як гэта бывае там, дзе ёсць прыёмныя дзеці.

Каб адчуваць дзіця, трэба мінімум паўгадзіны ў дзень размаўляць з ім не пра вучобу ці ежу. І рабіць гэта, седзячы побач, гледзячы ў вочы і трымаючы за рукі.

Паўгадзіны ў дзень

Мы заўсёды некуды бяжым, спяшаемся, баімся не паспець. І не бачым тых, што побач з намі, хто даражэйшы нам за ўсё на свеце. Яны ёсць — і добра, але ці добра ім?

— На самой справе ўсё даўнымдаўно вядома і напісана ў добрых разумных кніжках, — кажа Надзея Сараева. — Каб адчуваць дзіця, трэба мінімум паўгадзіны ў дзень размаўляць з ім не пра вучобу ці яду. І рабіць гэта, седзячы побач, гледзячы ў вочы і трымаючы за рукі. За гэтыя паўгадзіны любы бацька ці маці, калі яны насамрэч любяць сваё дзіця, што-небудзь ды адчуюць.

— А калі гэта «цяжкі» падлетак і ён не хоча сядзець, узяўшыся за рукі?

— Ён «цяжкі» таму, што не ведае, як сябе паводзіць. Мы лічым, што калі дзіця накормлена і апранута, гэтага дастаткова. Але ж мы не жывёлу гадуем, мы выхоўваем асобу. І да 18 гадоў яны ўсе — дзеці і падлеткі, якія маюць патрэбу ў апецы. Чаму тая ж маці не можа проста падысці і сказаць: мне дрэнна, паразмаўляй са мной. Калі дзіця не робіць першага кроку, зрабіце яго самі. Дзеці закрываюцца не ад нас, а ад нашых дзеянняў, калі мы пачынаем быць аўтарытарнымі без прычыны. Аўтарытэт бацькоў заўсёды ўзнімаецца, калі яны самі пачынаюць пытацца парады. Гэта не слабасць, гэта праява павагі да асобы дзіцяці.

Яшчэ лепш, калі гэта будуць не проста размовы, а нейкія сумесныя дзеянні. З зусім маленькімі дзецьмі звычайна гуляюць; з тымі, хто крыху старэйшы, нешта разам пякуць, цяслараць, з падлеткамі займаюцца разам спортам. Дзеці наогул не ўмеюць пра свае пачуцці расказваць. Тут важна назіраць за іх рэакцыяй, паводзінамі ў працэсе штодзённых зносін. Ведаеце, якую ролю выконвалі мексіканскія серыялы падчас распаду Савецкага Саюза? Выключна псіхатэрапеўтычную. Людзі вучыліся размаўляць адно з адным. Дзеці, якія глядзелі гэтыя серыялы, сталі гуляць у таты-мамы. Павінна быць культура прагаворвання. Унутрысямейныя зносіны — гэта лепшы спосаб зняцця стрэсаў і аздараўлення.

Грамадства ад гэтага, на жаль, адыходзіць. У нас у крамах паўфабрыкаты, у кожнага свой «айпад», «айфон». Але гэта праблема не дзяцей, а менавіта дарослых. Ці шмат сярод бацькоў такіх, якія могуць задаць сабе пытанне: «Што я такога зрабіў(ла), каб мой сын ці дачка мяне паважалі?». Памятаю, як адна жанчына расказвала: «Мае бацькі, калі я нешта рабіла не так, як яны чакалі, казалі: даруй, дачушка, мы так дрэнна цябе разумеем». Яны прасілі ў яе прабачэння за яе правіны. Па-сутнасці так і павінна быць. Калі б бацькі з сябе пачыналі, мы б не гублялі сваіх дзяцей.

Выклікаем... сябе на дуэль

Кажуць, цяжкі дзень — гэта панядзелак, але для 13-гадовага Сашы такім стаў аўторак — апошні ў гэтым студзені. Заняткі ў школе скончыліся, і дзеці хуценька разбегліся па дамах. Ён таксама паспяшаўся на аўтобус, які развозіў вучняў з іншых вёсак. На вуліцы было марозна, нават вокны ў салоне замерзлі. Хлопчык прыціснуў да шкла гарачую далонь, і пад ёю з'явілася невялічкае акенца. Так цікава было назіраць, што там за ім. Ну вось і прыпынак. Бацька ўжо дома, глядзіць тэлевізар. Саша вітаецца і моўчкі ідзе ў свой пакой пераадзявацца. Потым, як гэта было звычайна, адпраўляецца на кухню піць гарбату. Праз 15 хвілін туды ідзе бацька... Тое, што

Ці шмат сярод бацькоў такіх, якія могуць задаць сабе пытанне: «Што я такога зрабіў(ла), каб мой сын ці дачка мяне паважалі?».

ён убачыў, прывяло яго ў шок. На перакінутым цераз газавую трубу шаліку вісеў яго Сашка. Мужчына кінуўся ратаваць сына, але было ўжо позна...

З месца здарэння супрацоўнікі міліцыі забралі ліст паперы з малюнкамі хлопца і яго ссытак. Але адказ на пытанне «Чаму?» знайсці так і не змаглі.

— У заключэнні, якое мы выдаём у такіх выпадках, вы і не знойдзеце прамога адказу, — кажа **начальнік упраўлення судова-псіхіятрычных экспертыз упраўлення Дзяржкамітэта судовых экспертыз па Магілёўскай вобласці Антон БАЛАШОЎ.** — Выснова часцей за ўсё прыкладна адналькавая: на момант самагубства і напярэдадні смерці чалавек быў псіхічна здаровы. Наконт усяго астатняга мы можам толькі разважаць. Вось вы пытаецеся, ці існуе такое паняцце, як ген самагубства. Прамой сувязі тут, вядома, няма, але ёсць нейкія стэрэатыпы, якія ўплываюць. Адзін чалавек ведае выйсце з тупіка, а другі — не, яго не навучылі, як гэта рабіць. Можна выказаць здагадку, што гэта адбываецца на генетычным узроўні, а на самой справе гэта мадэль паводзін, якая засвоена ў сям'і і перадалася ў спадчыну. Нават калі чалавек адзін, у яго ёсць апанент — прычына. Ён абавязкова абвінавачвае кагосьці ў думках.

— Калі закранаць праблему прафілактыкі самагубстваў, трэба казаць аб праблеме існавання дысгарманічных сем'яў, — лічыць Антон Балашоў. — Гэта вонкава шчаслівыя сем'і, дзе бацькі прад'яўляюць вельмі завышаныя патрабаванні да сваіх дзяцей. Не рабі так, рабі гэтак, не кажы гэтай цётцы пра тое, а гэтаму дзядзьку пра гэтае. Я ўтрырую, але схема прыблізна такая. Дарослыя патрабуюць ад падлетка немагчымае, а гэта прыводзіць яго ў адчай. І тут нават прасцей тым, хто расце ў асацыяльных сем'ях. Яны дакладна ведаюць: скраў — значыць, пойдзе ў турму. У іх няма сумненняў. А калі чалавек не ведае, што яму рабіць, здараецца непапраўнае. Самы яскравы прыклад — гэта Рамэа і Джульета. Дадаць да гэтага няма чаго...

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.